Нацыянальная платформа
Форум грамадзянскай супольнасці
УСХОДНЯГА ПАРТНЁРСТВА

# Рэзалюцыя

Канферэнцыі Нацыянальнай платформы
Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства:

***“Напярэдадні чацвёртай штогадовай сустрэчы***
***Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства”***

*Мінск, 16 лістапада 2012 года*

Мы, удзельнікі Канфэрэнцыі Нацыянальнай платформы Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга парнёрства, грунтуючыся на падставах “Мемарандума аб супрацоўніцтве ў межах Нацыянальнай платформы Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга парнёрства”, паддзяляючы каштоўнасці і мэты ініцыятывы ЕС “Усходняе парнерства”:

- заяўляем аб сваім намеры далейшымі дзеяннямі спрыяць пашырэнню еўрапейска-беларускага ўзаемадзення;

- канстатуем, што асноўнай перашкодай для развіцця такога ўзаемадзення з’яўляецца пазіцыя і дзеянні беларускіх уладаў, у тым ліку ўтрыманне палітычных вязняў, рэпрэсіі ў адносінах да грамадскіх і палітычных актывістаў, адсутнасць сустрэчнага руху па падпісанні дамоў адносна пачатку візавага дыялогу і малога транспамежнага руху, не гледзячы на адпаведныя прапановы Еўрапескага Саюза;

- выказваем рашучы пратэст супраць пераследу ўладамі грамадскіх актывістаў, а таксама іншых палітзняволенных, у тым ліку і ўдзельнікаў Націянальнай платформы Форума грамадзяскай супольнасці Усходняга партнёрства. Мы настойваем на неадкладным вызваленні праваабароцы Алеся Бяляцкага, спыненні крымінальнага пераследу актывіста маладзёжнага аб’яднання “Саюз маладых інтэлектуалаў” Андрэя Гайдукова, а таксама на спыненні беспадстаўнага ціску і спроб ліквідацыі міжнароднага грамадскага аб’яднаня “Добрая воля”;

- патрабуем спынення крымінальнага пераследу журналіста Анджэя Пачобута, выказваем занепакоенасць з нагоды ціску на інтэлектуальны часопіс “Архэ” і пераслед яго галоўнага рэдактара Валеркі Булгакава. Лічым, што такія дзеянні насосяць непапраўную шкоду беларускай культуры і інтэлектуальнай супольнасці, і настойваем на іх спыненні;

- разглядаем ініцыятыву ЕС “Еўрапейскі дыялог па мадэрнізацыі з беларускім грамадствам” як значны і патэнцыйны інструмент дэмакратычных трансфармацый у краіне. Гэтая ініцыятыва тым больш важная і актуальная, што яна таксама з’яўляецца каталізатарам шэрагу працэсаў у межах Усходняга парнёрства. Віталі б пашырэнне ролі і ступені ўдзелу Нацыянальнай платформы Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства ў Еўрапейскім дыялогу па мадэрнізацыі Беларусі.